2. *Крепак, Б. А.* Михаил Савицкий. Красное и черное: палитра художника – в зеркале эпохи: очерки / Борис Крепак. – Минск : Мастац. літ., 2014. – 252 с.

3. *Медвецкий, С. В.* Белорусская тематическая живопись 1960–1990-х годов : пособие / С. В. Медвецкий. – Витебск : ВГУ, 2006. – 135 с.

4. *Пугачева, Э. Н.* Михаил Савицкий : изоматериал / Э. Н. Пугачева. – Минск : Беларусь, 1982. – 195 с.

5. *Сульянов, А. К.* Моя обязанность – создавать время: Беседы с Мастером : А. К. Сульянов и М. С. Савицкий / А. К. Сульянов. – Минск : Технопринт, 2003. – 91 с.

6. *Ходинская, Н. Н.* Военная тематика в исследованиях современных белорусских искусствоведов / Н. Н. Ходинская // Культура. Наука. Творчество : XIII Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 75-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков, Минск, 16 мая 2019 г. : сб. науч. ст. / редкол.: А. А. Корбут [и др.]. – Минск, 2019. – С. 521–526.

УДК 792.097(476)

# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТЭЛЕВІЗІЙНАГА ТЭАТРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

***У. А. Трапянок,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дырэктар дырэкцыі канала «Культура» генеральнага прадзюсарскага цэнтра Беларускага радыё, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

**Анатацыя**. Артыкул прысвечаны даследаванню асаблівасцей развіцця беларускага тэлетэатра на сучасным этапе (з 2018 г.). Аўтар выяўляе запатрабаваную форму тэлемастацтва, у якой існуе тэлетэатр, разглядае яго відавую і жанравую разнастайнасці, вызначае колькасную прысутнасць твораў, перанесеных са сцэнічнай пляцоўкі ў тэлевізійную прастору. У матэрыяле скарэктавана перыядызацыя беларускага тэлетэатра з вызначэннем наймення сучаснага перыяду.

**Ключавыя словы**: тэлевізійны тэатр, тэлеспектакль, рэтрансляцыя, тэлеверсія, тэлеканал «Беларусь 3».

**FUNCTIONING OF THE BELARUSIAN TELEVISION THEATER AT THE PRESENT STAGE**

***U. Trapianok,***
*PhD in Art History, Director of Channel Culture of the General Producer`s Center of Belarussian Radio, Associate Professor of the Department of Directing of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

**Abstract**. The article is about the peculiarities of the development of the Belarusian television theater at the present stage (since 2018). The author detects the form of television art, in which teletheater exists, determines its species and genre diversity, the quantitative presence of performances transferred from the stage to the television space. The article corrects the periodization of the Belarusian television theater with the definition of the name of the modern period.

**Keywords**: television theater, TV performance, retransmission, TV version, TV channel «Belarus 3».

Адлік гісторыі айчыннага тэлевізійнага тэатра вядзецца з 1956 г., калі ў тагачаснай медыяпрасторы з’явілася беларускае тэлебачанне. У першыя гады працы Мінскай тэлестудыі тэлевізійны спектакль у параўнанні з кіначасопісамі, кінафільмамі, канцэртнымі праграмамі займаў другасныя пазіцыі, што можна растлумачыць адсутнасцю ўзораў тэледрамы для паказу, агульнай перавагай кінематографа, які паклаў пачатак эры экраннай культуры. У першы эфірны дзень тэлевяшчання (1 студзеня 1956 г.) невялікай колькасці тэлегледачоў былі прапанаваны кіначасопіс «Навіны дня» і мастацкі фільм вытворчасці СССР «Поколение победителей» (1936 г., рэж. Вера Строева). Аднак, на нашу думку, цікавасць супрацоўнікаў Мінскай тэлестудыі да засваення новага віду тэлевізійнага мастацтва, а таксама развіццё нацыянальнага тэлевяшчання пад уплывам усесаюзных і сусветных працэсаў у тэлевытворчасці прывялі да станаўлення беларускага тэлетэатра.

Аснову масіву айчынных тэлепастановак у 1956–1959 гг. склалі творы рускай літаратуры. Рэпертуар беларускага тэлетэатра, пачынаючы з 1960 г., дапоўнілі пастаноўкі паводле эпічнай нацыянальнай прозы («Людзі на балоце» Івана Мележа, «Трэцяе пакаленне» Кузьмы Чорнага, «Трывожнае шчасце» Івана Шамякіна і інш.) [1].

Павелічэнню колькасці тэлеспектакляў, пастаўленых па творах беларускіх аўтараў, пасадзейнічаў, на нашу думку, пачатак рэтрансляцыі ў 1961 г. перадач Цэнтральнага тэлебачання з Масквы на тэрыторыі нашай рэспублікі, на творчы ўзровень і якасць нацыянальнага мастацкага тэлепрадукту паўплываў яго выхад на ўсесаюзны экран у 1962 г. У выніку беларускі тэлевізійны тэатр у савецкі час, як пісала Н. А. Агафонава, назапасіў значны мастацкі вопыт, у якім сканцэнтраваўся творчы пошук плеяды рэжысёраў, акцёраў, мастакоў, у лепшых пастаноўках былі рэалізаваны новыя формы тэлемастацтва, тэлевізійная студыя лічылася своеасаблівай тэатральнай лабараторыяй, дзе засвойваўся і па-свойму ўвасабляўся свет літаратуры розных краін. У мінулым стагоддзі было пастаўлена больш за 200 арыгінальных тэлевізійных спектакляў [1]. За гэты час беларускі тэлетэатр прайшоў тры перыяды развіцця – перыяд станаўлення (1956–1968 гг.), перыяд новых тэхнічных магчымасцей (1969–1985 гг.), перыяд «новай хвалі» (1986–1991 гг.) – і ўступіў у 1991 г. у чацвёрты, пераходны перыяд рэгрэсу, што вызначыўся не толькі скарачэннем колькасці тэлеспектакляў у эфіры, але і паступовым знікненнем тэледрамы, поўнага яе замяшчэння праграмамі размоўных жанраў і кінапрадукцыяй [5].

Са з’яўленнем у 2013 г. спецыялізаванага культуралагічнага тэлеканала «Беларусь 3» у функцыянаванні айчыннага тэлетэатра адбыліся станоўчыя змены – тэлеспектаклі пачалі паступова вяртацца на тэлеэкраны. Такім чынам, год стварэння тэлеканала «Беларусь 3» можна назваць пачаткам пятага, сучаснага перыяду развіцця айчыннага тэлетэатра.

Згодна з тэорыяй тэлетэатра, асноўнымі ўзроўнямі яго ўнутранай структуры з’яўляюцца трансляцыя, адаптацыя і крэацыя. Трансляцыя і адаптацыя адносяцца да варыянтаў рэпрадукцыйнай формы тэлемастацтва. Трансляцыя прадугледжвае практычна поўны «перанос» існуючых тэатральных твораў у тэлевізійнае асяроддзе. Падчас адаптацыі адбываецца трансфармацыя эстэтычнай прыроды тэатральнага твора, яго транскрыпцыя [1]. Крэацыя, ці крэатыўны ўзровень, вызначаецца стварэннем новых, самастойных твораў без ранейшай тэатральнай пастаноўкі-асновы, у выніку чаго з’яўляюцца арыгінальныя тэлеспектаклі, якія функцыянуюць у тэлевізійнай рэальнасці. Менавіта крэацыя лічыцца найвышэйшай праявай тэлевізійнага мастацтва [5].

З 2013 г. да 2017 г. не было створана ніводнага арыгінальнага тэлеспектакля. У той час тэлевізійны тэатр Беларусі развіваўся аднабакова – згодна з рэпрадукцыйнай формай тэлемастацтва. Колькасць падрыхтаваных адаптацый была невялікай: «Выкраданне Еўропы, альбо Тэатр Уршулі Радзівіл», «Translations» і «Сымон-музыка» (Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), «Адвечная песня» (Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі), «Пінская шляхта» (Палескі драматычны тэатр) [4].

Для вызначэння найменняў новых твораў тэлетэатра і іх колькасці ў перыяд з 2018 г. да нашых дзён намі была прааналізавана праграма перадач тэлеканала «Беларусь 3», у выніку чаго мы прыйшлі да наступных высноў.

У мастацкія аўдыяльныя фонды тэлеканала дадаліся, у прыватнасці, тэлеверсіі спектакляў «Хто смяецца апошнім» па п’есе К. Крапівы (Тэатр-студыя кінаакцёра, 2020 г.), «Дзед» па творы В. Паніна (Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, 2020 г.), «Пясняр» па п’есе В. Дранько-Майсюка (Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага, 2021 г.), «Адамавы жарты» паводле твораў Ф. Аляхновіча і Л. Радзевіча (Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, 2021 г.), «Не пакідай мяне» па п’есе А. Дударава і «Леаніды не вернуцца на зямлю» па творы У. Караткевіча (Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа, 2021 г.), новая версія спектакля «Паўлінка» па аднайменнай камедыі Я. Купалы (Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы, 2021 г.).

У аўдыявізуальную медыяпрастору за апошнія гады перанесена большая колькасць спектакляў, пастаўленых на сцэнах музычных тэатраў Беларусі. Сярод іх балеты і оперы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава, «Багема» і «Вілісы. Фатум» Д. Пучыні, «Баядэрка» Л. Мінкуса, «Вітаўт» і «Анастасія» В. Кузняцова, «Стварэнне свету» А. Пятрова, «Пер Гюнт» Э. Грыга, «Канёк-Гарбунок» Р. Шчадрына, запісы праекта «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў» і інш.), пастаноўкі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра («Сільва» І. Кальмана), Маладзёжнага тэатра эстрады (караоке-шоу «Сваты»), мюзікл Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «Дуброўскі» К. Брэйтбурга і інш.

Унікальная трансляцыя оперы П. Чайкоўскага «Яўген Анегін» адбылася на тэлеканале «Беларусь 3» у лютым 2018 г. у межах праекта «Метраполітэн-опера прадстаўляе». Падобнага кшталту трансляцыі даюць магчымасць гледачу знаёміцца з яркімі сцэнічнымі работамі, тэндэнцыямі сусветнага тэатральнага працэсу, адкрываць для сябе новыя імёны таленавітых пастаноўшчыкаў і выканаўцаў. Аднак трансляцыя замежнай оперы «Яўген Анегін» была адзінкавай, праект не атрымаў развіцця ў беларускім тэлеэфіры.

Практыка запісаў драматычных і музычных спектакляў стала за апошнія гады запатрабаванай. Па словах супрацоўнікаў тэлеканала «Беларусь 3», асаблівай папулярнасцю ў тэлегледачоў карыстаюцца балетныя спектаклі, творчая група тэлеканала пры выбары спектакляў для запісу арыентуецца найперш на прэм’ерныя сцэнічныя творы [3].

Трансляцыі тэлеверсій спектакляў набылі даволі пастаяннае месца ў вяшчальнай сетцы тэлеканала «Беларусь 3» – пераважна па суботах і нядзелях у другой палове дня ці познім вечарам, прэм’ерныя запісы могуць перадавацца і ў іншыя дні. У жанрава-відавой разнастайнасці і колькасці тэлеверсій заўважана хаатычнасць, напрыклад, у адну суботу могуць быць паказаны некалькі спектакляў (драматычны і музычны, два музычныя творы), праз тыдзень у вяшчальнай сетцы няма ніводнага запісу). Выбар тэлеверсій пастановак часам адбываецца ў залежнасці ад каляндарных дат ці з нагоды свята (напрыклад, да Дня беларускага пісьменства).

Зробленыя тэлеканалам «Беларусь 3» запісы сцэнічных твораў з-за невялікай іх колькасці часта паўтараюцца. Мяркуем, для большай эфірнай разнастайнасці можна было б выкарыстоўваць архіўныя тэлеспектаклі, тым больш што такая практыка ўжо прадпрымалася. Напрыклад, у 2018 г. у эфіры трансліраваліся фондавыя тэлеспектаклі «Камедыянт» па творах В. Дуніна-Марцінкевіча, «Пратарчака жыцця, або Запіскі Самсона Самасуя» паводле сатырычнага рамана А. Мрыя, «Мілы чалавек» па камедыі К. Крапівы, «Хлопцы апошняй вайны» паводле паэмы А. Куляшова; у 2019 г. гледачам быў прапанаваны тэлеспектакль «Песня пра зубра» па творы М. Гусоўскага.

Такім чынам, сучасны тэлевізійны тэатр Беларусі функцыянуе выключна ў рэпрадукцыйнай форме (узровень трансляцыі), прапануе сённяшняму гледачу запісы музычных і драматыч-

ных спектакляў, пастаўленых у тэатрах розных гарадоў краіны. Трансляцыі тэлеверсій пастановак адбываюцца на спецыялізаваным тэлеканале «Беларусь 3», тэндэнцыяй якога за апошнія гады стала павелічэнне аб'ёмаў тэатральнага кантэнту розных відаў і жанраў. З 2013 г. айчынны тэлетэатр уступіў у сучасны перыяд развіцця, які можна назваць перыядам рэтрансляцый.

1. *Агафонова, Н. А.* Телевизионный театр Беларуси: становление и тенденции развития : автореф. дис. … канд. искусствоведения : 17.00.03 / Н. А. Агафонова ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы НАН Беларуси. – Минск, 1992. – 20 с.

2. *Нечай, О. Ф.* Развитие белорусского телевидения : (материал в помощь лектору) / О. Ф. Нечай. – М. : Общество «Знание», 1982. – 22 с.

3. Телеканал «Беларусь 3» приглашает зрителей на театральную неделю [Электронный ресурс] // Беларусь сегодня : сайт. – 19 марта 2021 г. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/teatr-u-galo-nay-roli.html. – Дата доступа: 29.05.2022.

4. *Трапянок, У. А.* Развіццё тэлетэатра незалежнай Беларусі і праблемы сучаснага мастацкага тэлевяшчання краіны / У. А. Трапянок // Культура: открытый формат-2016 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редсов.: В. Р. Языкович (пред.) [и др.]. – Минск, 2017. – С. 368–371.

5. *Трапянок, У. А.* Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі / У. А. Трапянок ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2019. – 208 с.

УДК 791.228:004.92(510)

# ОСОБЕННОСТИ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ 3D-ТЕХНОЛОГИЙ В АНИМАЦИОННОМ ФИЛЬМЕ «УДИВИТЕЛЬНЫЙ КОСМОС МЕДВЕДЕЙ»

***У Юе*** *(КНР),*
*соискатель ученой степени кандидата искусствоведения,*
*учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», г. Минск, Беларусь*

**Аннотация.** Применение 3D-технологий в современном кино принципиально меняет и процесс производства фильма, и процесс его восприятия. В настоящее время технология чаще остается своего рода